**А. М. Власавец,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі гімназія № 2 г. Пінска

**Урок беларускай мовы ўXI класе**

**Тэма: Знакі прыпынку ў складаназлучаных і складаназалежных сказах.**

**Мэты:**

- абагульніць, сістэматызаваць і паглыбіць веды навучэнцаў пра правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназлучаных і складаназалежных сказах;
- удасканаліць уменні і навыкі правільна інтанаваць складаназлучаныя і складаназалежныя сказы, ставіць знакі прыпынку ў іх; развіваць аналітычнае мысленне вучняў;
- выхоўваць пачуццё павагі і пашаны да роднай мовы, нацыянальных каштоўнасцей.

**Тып:** урок падагульнення і сістэматызацыі ведаў.

**Абсталяванне:** Валочка Г. М., Васюковіч Л. С., Міхнёнак С. С., Саўко У. П. Беларуская мова: вуч. дапам. для 11-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і руск. мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання. – Мінск: НІА, 2010; табліцы са сказамі; карткі з заданнямі.

**Ход урока**

**I.Арганізацыйны момант.**

**II.Этап праверкі дамашняга задання. Арфаграфічная хвіліна.**

*Мэта*: падрыхтоўка да экзаменаў.

*Заданне:* запісаць словы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі. (Адзін вучань працуе каля дошкі).

*Каляды, Масленіца, Вербная нядзеля, Вялікдзень, Прасвятая Троіца, Дзень памяці, Божы дар, Радаўніца, дай божа, дзякаваць богу.*

– Напісанне якіх слоў выклікала ў вас сумненні?

– Для чаго мы працавалі з гэтымі словамі?*( Каб паўтарыць правапіс вялікай і малой літар).*

**III.Пастаноўка тэмы і задач урока.**

**IV. Этап актуалізацыі раней засвоеных ведаў.**

***1. Актуалізацыя ведаў*** па тэме "Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах" з выкарыстаннем табліцы падручніка "Інтанаванне складаназлучаных сказаў" (с. 232- 238).

***2. Зварот да § 45 падручніка.***

***3. Выкананне задання на картцы.*** Запісаць сказы, аформіўшы згодна з пунктуацыйнымі нормамі, пабудаваць схемы.

*1.Большасць народных свят працягвалася адзін дзень аднак існавалі і шматдзённыя святы (К, к)аляды ( Г,г)уканне вясны (М, м)асленіца. 2.Прыйшла талака лі па кубку малака. 3. На жаль многія старыя гасцінныя звычаі пакрысе вымiраюць і гарадскі чалавек можа не ведаць жыхара з суседняга пад'езда.*

***4. Артыкуляцыйная гімнастыка.*** У запісанай на дошцы скорагаворцы пастаўіць знакі прыпынку і растлумачыць:

*Бела кура крупы клюе*

*І кур крупы клюе.*

*Не клюй кур круп.*

Пасля выканання задання вучні трэніруюцца ў вымаўленні скорагаворкі.

***5. Актуалізацыя ведаў*** па тэме "Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах" з выкарыстаннем табліцы падручніка "Інтанаванне складаназалежных сказаў" (с. 239- 244).

***6. Актуалізацыя ведаў*** па тэме "Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі" з выкарыстаннем табліцы.

***7. Зварот да § 46 падручніка.*** Вучні павінны адказаць на пытанне, аб чым не было гаворкі.

**V. Кантрольна-карэкцыйны этап.**

***1. Вуснае выкананне практыкавання 249 падручніка*.**

Заданні:

– Вызначыць стыль тэксту.

– Чым характарызуецца народны каляндар беларусаў?

– Хто мог быць дзейнымі асобамі календара?

– Называючы складаназалежныя сказы, растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку паміж прэдыкатыўнымі часткамі, вызначыць сэнсавыя адносіны.

***2. Работа з тэкстам практыкавання 250 падручніка.***

Заданні да тэксту:

– Вызначыць стыль, тэму, даць тэксту назву.

– Адказаць на пытанні:

- ✓ *Чаму святы Мікалай лічыцца ў беларусаў найбольш паважаным?*
- ✓ *Калі адзначаюць свята праваслаўныя, а калі – каталікі?*

– Выпісаць з тэксту складаназлучаныя і складаназалежныя сказы, пунктуацыйна афарміць, пабудаваць схемы:

1 варыянт – з першага абзаца,

2 варыянт – з астатняй часткі тэксту.

***3. Творчае заданне "Крок у ЦТ".***

Дайце рэкамендацыю аднакласніку, які :

*а) рыхтуецца да ЦТ і займаецца паўтарэннем;*

*б) паўтарае тэму "Знакі прыпынку ў складаназлучаных і складаназалежных сказах",* выкарыстаўшы складаназлучаны або складаназалежны сказ.

***4. Работа па картках.*** Спісаць тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку.

*(Н..)водная з тутэйшых жанчын у дні што аддзялялі Нараджэнне Хрыстова ад свята Трох каралёў (н..)за што на свеце (н..)разу (н..) пакруціла б верацяном бо тады вясной хатняя птушка паздыхала б ад завароту галавы. (Н..)водная ў дзень Паднясення Святога Крыжа (н..)*

*хадзіла ў грыбы і ягады бо тады навяла б лясных гадаў на сваю хату. (Н..) водная жнучы (н..) ўпускала з пільнай увагі каб выпадкова (н..) зрэзаць сярпом звязаных ці заламаных каласоў бо звязвае іх так альбо заломвае (н..) добразычлівая рука на (н..)шчасце той якая іх сажне.*

Паводле Э. Ажэшкі

Дадатковыя пытанні і заданні:

– Раскрыць алегарычны сэнс прыказкі "І дурань ведае, што ў нядзелю свята". *(Тое, што лічыцца агульнавядомым, не патрабуе доказу).*

– Растлумачце паходжанне слова *нядзеля.( Ад слоў не делать, не рабіць спраў).*

– Як называюцца "звязаныя ці заламаныя каласы", якія , згодна з уяўленнямі забабонных людзей, могуць наклікаць бяду на гаспадара нівы? *(Залом).*

***5. Тэматычны кантроль*** (тэставае заданне на картках).

***1 варыянт***

1. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

*а) Яшчэ некалькі дзён – і прачнецца бярозавік.*

*б) Хай свеціць сонца і радуюцца дзеці.*

*в) Хоць дзьмуў халодны вецер, натоўп не разыходзіўся.*

*г) А з'ясі ты з бульбай шкварку, і работа пойдзе шпарка.*

2. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх паміж часткамі ставіцца дзве коскі:

*а) Каб любіць Беларусь маю мілую трэба ў розных краях пабываць.*

*б) Зямля калі глядзіш на яе з акна самалёта нагадвае ярка пафарбаваную геаграфічную карту.*

*в) Для таго каб праца давала плённыя вынікі трэба прывучаць да сталых і сур'ёзных адносін да яе з малых гадоў.*

*г) Ён сказаў што калі будзе свабодны то вечарам прыйдзе да мяне.*

3. Адзначце складаназалежныя сказы з трыма дадзенымі часткамі:

*а) Шкада мне зялёнай нівы таго дуба што над рэчкай песціцца ў прыволлі.*

*б) Каб светлым вясёлым у кожнага дом быў кааб людзі да старасці мірна жылі кааб сонца не гасла ад атамнай бомбы мы будзем змагацца за мір на зямлі.*

*в) Калі шануем тую мову якую продкі зберaглі скажы на ёй такія словы каб у вяках яныжылі.*

*г) Зося прыгадала што вярнуўшыся з Германіі яна не знайшла магілу бацькі хоць помніла дзе яго пахавалі.*

4.Адзначце сказы, уякіхзнакі прыпынку пастаўлены правільна:

*а) Раз і назаўсёды запомні, што калі нікога няма ў пакоі, не маеш права заходзіць.*

*б) Усё пакінуць след павінна, бо, як пачаўся белы свет, прамень, пясчынка і расінка нязменна пакідаюць след.*

*в) Цімох адчуваў, што калі пачне гаварыць, то заплача ад крыўды, злосці і жалю.*

*г ) Гэта было так нечаканаштопакуль я знімаўружжо з пляча, ад кабана і след прастыў.*

***2 варыянт***

1. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

*а) Кожны праўду знае, ды не кожны яе любіць.*

*б) Карацей кажучы экзамены закончыліся і пачаліся канікулы.*

*в) Маці паставіла вячэру, і сама села побач.*

*г) Імгненне – і зноў усё патанула ў змроку.*

2. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх паміж часткамі ставіцца тры коскі:

*а) Хто не спытаў хоць раз трывогі жыццю не ведае цаны.*

*б) Кожны хто хоча ўмацаваць сваё здароўе павінен займацца спортам.*

*в) Часам прыходзіць да чалавека такое імгненне калі нясцерпна да болю хочацца пабачыць тыя мясціны дзе калісь хадзіў у маленстве.*

*г) Было добра ўтульна сядзець пад дубам і адчуваць спінаю яго магутны камель пазіраць на камяністую дарогу што была зусім блізка і вяла ў лес.*

3. Адзначце складаназалежныя сказы з дзвюма дадзенымі часткамі:

*а) Люблю твае Нарач затокі і тоні як вецер густыя туманы развееці снежная пена на хвалях зазвоніць.*

*б) Па справах толькі пазнаецца хто людзям заўсёды прыносіць карысць і хто чалавека ў бядзе не пакіне.*

*в) Калі наступае глыбокая восень над зямлёй нізка сцелецца туман або імжыць дробны дождж.*

*г) А калі Маша пачала раіць якія закускі можна згатаваць з тых прадуктаў якія Тарас выцягнуў з пограба Валянціну Андрэеўну здзівілі яе кулінарныя веды.*

4. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

*а) Ён ведаў, што, каб чаго-небудзь дабіцца, трэба адольваць кволасць, неахвоту, страх.*

*б) Васіль адчуваў,што, калі ўпадзе ў снег,то ўжо не ўстане.*

*в) Я пішуМарынцы, каб, як скончыццабудаўніцтва, вярталася ў Мінск.*

*г) Каля кастразастаўсяправаднік, якіпакуль хлопцы лавілі рыбу, прыгатаваўвячэру.*

**VI. Дамашняе заданне.** §45-46, напісаць сачыненне-мініяцюру аб народных святах на адну з тэм: “*Свята беларускага народнага календара”, “Маё любімае народнае свята”, “Сямейная абраднасць беларусаў”.*

**VII. Падагульняльна-рэфлексійны этап.**

Выстаўленне адзнак за ўрок.

***Прыём «Дапоўні фразу».***

“*Галоўным для мяне на ўроку было…”*